За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 10 (105) Чэрвень 2015 г.

Суд над віцебскім праваабаронцам ідзе ў закрытым рэжыме



1 чэрвеня ў Віцебску пачаўся суд над заснавальнікам арганізацыі «Платформ інавэйшан» Міхаілам Жамчужным. Працэс праходзіць у Віцебскім абласным судзе ў закрытым рэжыме.

Паводле папярэдніх зьвестак, Міхаіла Жамчужнага вінавацяць паводле трох артыкулаў Крымінальнага кодэксу — 376 (часткі 1, 2), 375 (частка 1) і 431 (часткі 1, 2) — у наўмысным раскрыцьці зьвестак, якія ўтрымліваюць службовую таямніцу, незаконным набыцьці (вырабе) сродкаў для непублічнага атрыманьня інфармацыі, якая ўяўляе службовую таямніцу, і ў даваньні хабару.

Што працэс будзе закрыты, было вядома загадзя. Віцебскі праваабаронца Павал Левінаў, які яшчэ да пачатку прыйшоў у абласны суд, зафіксаваў працэсуальныя парушэньні.

«Паводле заканадаўчых нормаў, кожны працэс пачынаецца аднолькава: усіх ахвотных запрашаюць у залю, судзьдзя распачынае працу, прадстаўляецца, называе імёны і прозьвішчы ўдзельнікаў працэсу і толькі потым абвяшчае сваё рашэньне — маўляў, працэс будзе закрыты. Я прыйшоў, каб даведацца, хто сакратар на працэсе, хто дзяржаўны абвінаваўца, хто адвакат падсуднага. І, урэшце, як выглядае сам Міхаіл Жамчужны... Аднак я прастаяў пэўны час у фае суду, а ў залю ніхто нікога так і не запрасіў! Пра гэта я напісаў скаргу на імя старшыні абласнога суду. Бо інакш як непаважным стаўленьнем да грамадзян з боку работнікаў суду гэтую сытуацыю не назавеш!» — апавёў Павал Левінаў.

Убачыць падсуднага спадару Левінаву не ўдалося: машына зь СІЗА, дзе ўтрымліваюць Міхаіла Жамчужнага, адразу заехала ва ўнутраны двор, і браму зачынілі.

Справу Міхаіла Жамчужнага разьбірае судзьдзя абласнога суду Валянціна Буева. Пра гэта паведаміў яшчэ адзін віцебскі праваабаронца, Леанід Сьвецік: «Я лістуюся зь Міхаілам Жамчужным. У апошнім лісьце, напісаным напярэдадні суду, гаворыцца, што судзьдзёй прызначаная Валянціна Буева. Але спачатку былі прызначаныя іншыя судзьдзі, мужчыны, зазначае Жамчужны. Аднак яны адзін за адным адмовіліся весьці справу, як толькі азнаёміліся зь яе матэрыяламі».

Паводле зьвестак зь лістоў, якія Міхаіл Жамчужны адсылаў на волю, пачуваецца ён добра, нягледзячы на складаныя ўмовы жыцьця ў СІЗА і досыць паважны ўзрост — 60 гадоў. Настроены Жамчужны рашуча. У лісьце да грамадзкай актывісткі Ганны Шапуцькі ён пісаў: «Матэрыялы справы — спрэс фальсыфікацыя і супярэчнасьці. Паспрабую ў часе суду гэтым скарыстацца».

З прыватнага ліставаньня таксама вядома, што ён адмовіўся супрацоўнічаць са сьледзтвам, спаслаўшыся на артыкул 27 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, які дазваляе грамадзяніну адмовіцца ад любых сьведчаньняў, якія могуць быць выкарыстаныя супраць яго самога.

Арганізацыю «Платформ інавэйшан» Міхаіл Жамчужны заснаваў разам з Андрэем Бандарэнкам, і затрымалі спадара Жамчужнага неўзабаве пасьля арышту Бандарэнкі, у жніўні 2014 году. Паколькі ў Віцебску ён ня меў блізкіх сваякоў, пра ягонае апошняе затрыманьне і арышт стала вядома не адразу.

Жаданьне займацца праваабарончай дзейнасьцю былы дацэнт Віцебскага тэхналягічнага ўнівэрсытэту, кандыдат тэхнічных навук, вядомы ў акадэмічным асяродку дасьледчык і вынаходнік Міхаіл Жамчужны тлумачыў наступным чынам. Ён заўжды займаўся чыстай навукай, выкладаў ва ўнівэрсытэце, кіраваў дасьледчай лябараторыяй, якая працавала над атрыманьнем вадароду дзеля выкарыстаньня ў прамысловасьці.

Аднак у 2008 годзе на Жамчужнага завялі крымінальную справу за эканамічныя злоўжываньні. Скончылася прысудам... Пасьля вызваленьня ў 2012 годзе Жамчужны заявіў, што справа супраць яго была сфабрыкаваная. Міхаіл спрабаваў быў абскардзіць свой прысуд, аднак справа была задужа складаная: яна тычылася навуковых распрацовак і вымагала вялікіх грошай на адвакатаў. Таму ад ідэі рэабілітаваць сваё імя спадар Жамчужны адмовіўся, але на працу ва ўнівэрсытэт, дзе яго абвінавацілі, прынцыпова не вярнуўся.

Адбыўшы тэрмін, ён і вырашыў далучыцца да праваабаронцаў. Да яго зьвярталіся людзі, зь якімі ён раней быў за кратамі. Яны паведамлялі яму пра тыя ці іншыя праблемы ў месцах пазбаўленьня волі.

Праваабаронца Павал Левінаў падаў у суд на Белтэлерадыёкампанію

Сваю «скаргу на дзеяньні дзяржаўнага органу, якія ўшчамляюць права на свабоднае выказваньне меркаваньня» **Павал Левінаў** накіраваў у суд Першамайскага раёну Менску. Ён просіць суд абавязаць Нацыянальную дзяржаўную тэлерадыёкампанію даць яму магчымасьць выступіць у этэры тэлеканалу «Беларусь-1».

Такім спосабам віцебскі праваабаронца хоча дамагчыся рэалізацыі свайго права на абвяржэньне зьвестак, распаўсюджаных у тэлепраграме «Клюб рэдактараў» 7 лютага (з паўторам 9 лютага), якія, на яго думку, не адпавядаюць рэчаіснасьці і зьневажаюць яго гонар, годнасьць і дзелавую рэпутацыю.

У згаданым выпуску тэлепраграмы, які збольшага быў прысьвечаны праблемам ва Ўкраіне, цягам амаль трох хвілін абмяркоўвалася сустрэча беларускіх праваабаронцаў са спэцыяльным дакладчыкам ААН па правах чалавека ў Беларусі **Міклашам Харашці**, што адбылася ў Вільні. Падчас абмеркаваньня ў этэры даваліся нэгатыўныя ацэнкі дзеяньням праваабаронцаў.

Так, старшыня Белтэлерадыёкампаніі **Генадзь Давыдзька** неаднаразова зьняважліва выказваўся аб праваабаронцах, называючы іх «так званымі праваабаронцамі», якія нешта ўкладвалі «яму [Міклашу Харашці] там у вушы». А госьць тэлепраграмы, дэпутат Менскага гарсавету **Георгі Атаманаў**, ужыў выраз «праваабарончая шпана».

Павал Левінаў, які быў адным з удзельнікаў сустрэчы беларускіх праваабаронцаў са спэцдакладчыкам ААН, палічыў што выказваньні, што прагучалі ў этэры дзяржаўнай тэлевізіі, ня толькі не адпавядаюць рэчаіснасьці, але і зьняважылі яго асабіста:

«Займаюся праваабарончай дзейнасьцю больш за 40 гадоў, зьяўляюся сябрам Рады Рэспубліканскага праваабарончага грамадзкага аб'яднаньня «Беларускі Хэльсынскі Камітэт» і прадстаўніком аб'яднаньня на тэрыторыі гораду Віцебску і Віцебскай вобласьці. Усё, што прагучала ў тэлеперадачы «Клюб рэдактараў», лічу не адпаведным рэчаіснасьці і зьневажальным для майго гонару і годнасьці. Не адпавядаюць рэчаіснасьці зьвесткі аб праваабаронцах, аб нашым месцы і ролі ў беларускім грамадзтве, інфармацыя пра тое, што мы зьяўляемся «праваабарончай шпаной», а таксама што мы рабілі нейкія маніпуляцыі з вушамі спэцыяльнага дакладчыка, мандат якога быў уведзены рэзалюцыяй Рады па правах чалавека ААН».

Перад тым, як зьвярнуцца ў суд, Павал Левінаў паспрабаваў быў вырашыць пытаньне праз зварот наўпрост у Белтэлерадыёкампанію. Ён спасылаўся на артыкул 41 Закону «Аб сродках масавай інфармацыі», згодна з часткай 1 якога фізычныя асобы маюць права патрабаваць ад юрыдычнай асобы, на якую ўскладзеныя функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, абвяржэньня распаўсюджаных зьвестак, калі гэтыя зьвесткі не адпавядаюць рэчаіснасьці, зьневажаюць іх гонар, годнасьць або дзелавую рэпутацыю. Аднак кіраўніцтва Белтэлерадыёкампаніі адказала на патрабаваньне праваабаронцы адмовай.



Таксама Левінаў спадзяваўся заручыцца падтрымкай органаў МУС. Была напісаная заява у міліцыю, у якой праваабаронца прасіў прыцягнуць удзельнікаў тэлеперадачы, якія дапусьцілі некарэктныя выказваньні ў этэры, да адміністрацыйнай адказнасьці паводле артыкулу 9.3 КаАП («зьнявага»). Але і міліцыянты нічым не дапамаглі.

Цяпер у сытуацыі мусіць разабрацца суд, якому трэба даць адказ, наколькі патрабаваньні віцебскага праваабаронцы зьяўляюцца абгрунтаванымі і слушнымі.

У Глыбокім будуць судзіць незалежных журналістаў

На глыбоцкіх журналістаў Тацьцяну Смоткіну і Зьмітра Лупача склалі пратаколы за парушэньне заканадаўства аб СМІ паводле артыкулу 22.9 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях (незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ). Суд над Тацьцянай адбудзецца 9 ліпеня, над Зьмітром — 10 ліпеня.



25 чэрвеня абодвух журналістаў апытаў старшы інспэктар аддзелу аховы правапарадку і прафілактыкі Глыбоцкага РАУС Вячаслаў Барыла. Празь некалькі дзён ён жа склаў пратаколы аб правапарушэньнях.

"Падчас складаньня пратаколу я сказала, што адмаўляюся адказваць на пытаньні, бо 27-ы артыкул Канстытуцыі дазваляе ня сьведчыць супраць самой сябе. А ў судзе гатовая паўтарыць, што Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь дае права кожнаму грамадзяніну як здабываць інфармацыю, так і дзяліцца ёй зь іншымі", - распавяла Тацьцяна Смоткіна.

Супраць Тацьцяны распачатая адміністрацыйная справа за артыкул "Дарогі ў Глыбокім стануць пазытыўнымі", размешчаны 9 чэрвеня на сайце Беларускага "Радыё Рацыя" (Польшча). Паводле матэрыялаў справы, яна ініцыяваная Глыбоцкай пракуратурай. Міліцыі было дадзенае даручэньне спраўдзіць, ці мае журналістка акрэдытацыю ад замежнага СМІ, і ці зьяўляецца яе журналісцкая дзейнасьць правапарушэньнем. На думку міліцыі, гэта так, і старшы інспэктар Вячаслаў Барыла перадаў дакумэнты справы ў суд.

Перададзеныя ў суд і матэрыялы адміністрацыйнай справы Зьмітра Лупача. Яго вінавацяць паводле таго самага артыкулу 22.9 КаАП за матэрыял "Знайшліся сваякі памежніка, які загінуў на Глыбоччыне 17 верасьня 1939 году", размешчаны на сайце "Эўрарадыё".

Пратакол пра правапарушэньне склаў таксама старшы інспэктар Вячаслаў Барыла, кажа Зьміцер: *"У маёй справе ёсьць раздрукоўка гэтага тэксту з інтэрнэт-сайту без пазначэньня аўтарства, а таксама ксэракопія з газэты "Вольнае Глыбокае", дзе пад артыкулам стаіць маё прозьвішча. На думку супрацоўніка міліцыі, аўтарства артыкулу ў газэце зьяўляецца доказам таго, што я супрацоўнічаю і з замежным СМІ. Вінаваты я нібыта таму, што "разьмясьціў гэты матэрыял у кампутарнай сетцы інтэрнэт". Сфармуляванае гэтае абвінавачаньне ня дужа літаратурна, дый само яно не адпавядае рэчаіснасьці — я нічога нідзе не разьмяшчаў, не распаўсюджваў, а напісаньне артыкулаў і збор інфармацыі не зьяўляецца правапарушэньнем"*.

У Віцебску затрымалі крышнаітаў

Спроба распаўсюду духоўнай літаратуры на вуліцах Віцебску завяршылася для пасьлядоўнікаў Міжнароднага таварыства сьвядомасьці Крышны затрыманьнем і некалькімі гадзінамі, праведзенымі ў міліцэйскім пастарунку. Непасрэдны ўдзел у затрыманьні вернікаў браў галоўны спэцыяліст аддзелу па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Віцебскага аблвыканкаму Сяргей Фадзеенкаў.

Распавядае адзін з затрыманых **Аляксандар Гранкін**: *«17 чэрвеня я знаёміў людзей у Віцебску зь ведычнымі ведамі аб правільным харчаваньні, здаровым ладзе жыцьця, самаразьвіцьці і філязофіі ўсходняй рэлігіі Гаудыя-вайшнавізму. Тым грамадзянам, якія праяўлялі жывую цікавасьць да гэтых тэмаў, мной дарыліся кнігі і брашуры. Галоўны спэцыяліст аддзелу па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Віцебскага аблвыканкаму Фадзеенкаў, не праяўляючы ніякай цікавасьці да згаданых тэмаў, супраць маёй волі забраў у мяне чатыры кнігі, дзьве зь якіх потым вярнуў. Мае неаднаразовыя патрабаваньні вярнуць астатнія кнігі ён праігнараваў».*

8-10 кнігаў былі адабраныя і ў іншага верніка, **Паўла Іванова**: *«Фадзеенкаў разам зь невядомым мне чалавекам, не прадставіўшыся, без тлумачэньня прычын, з прымяненьнем фізычнай сілы адвёў мяне ў больш бязьлюдное месца, дзе забраў у мяне кнігі. Пасьля чаго падманным шляхам завабіў мяне ў будынак Камітэту дзяржаўнага кантролю, дзе ўтрымліваў супраць маёй волі».*



Яшчэ адзін пацярпелы, **Аляксей Уласюк** сьцьвярджае, што ў дачыненьні да яго таксама прымянялася фізычная сіла. Ён таксама апынуўся ў будынку Камітэту дзяржаўнага кантролю, куды яго, паводле ягоных словаў, завялі гвалтоўна і пасьля перашкаджалі выхаду вонкі.

Супрацоўнікі міліцыі, якія прыбылі на месца, даставілі вернікаў у АУС Кастрычніцкага раёну Віцебску. Крышнаіты кажуць, што там іх пратрымалі амаль пяць гадзін, адкуль адпусьцілі пасьля спраўджваньня асобаў без складаньня пратаколаў.

Вернікі лічаць, што сваімі супрацьпраўнымі дзеяньнямі галоўны спэцыяліст аддзелу па справах рэлігіяў Фадзеенкаў перашкодзіў рэалізацыі іх правоў на свабоднае выказваньне меркаваньня і на свабоду думкі, сумленьня і рэлігіі, неправамерна завалодаў маёмасьцю, якая належала ім, і пазбавіў іх волі. Яны заяўляюць, што маюць намер скардзіцца ў Віцебскі аблвыканкам і пракуратуру.

Віцебскі актывіст ня змог адстаяць у судзе сваё права на атрыманьне дапамогі па беспрацоўі

Нягледзячы на тое, што з 2 траўня 2013 году грамадзкі актывіст Рафаэль Габрыэль Саламонавіч Кірылаў-Шмільхольдхард зарэгістраваны ў гарадзкім цэнтры занятасьці ў якасьці беспрацоўнага, дапамогі па беспрацоўі ён не атрымлівае: ад яго патрабуюць спачатку адпрацаваць на грамадзкіх працах 22 працоўныя дні. Актывіст паспрабаваў зьмяніць сытуацыю, зьвярнуўшыся ў суд, але гэта яму не дапамагло.

Судзьдзя суду Кастрычніцкага раёну гораду Віцебску Алена Папкова, разгледзеўшы скаргу актывіста на адмову Віцебскага гарадзкога ўпраўленьня па працы, занятасьці і сацыяльнай абароне насельніцтва ў выплаце яму дапамогі па беспрацоўі, пакінула пададзены працэсуальны дакумэнт бяз руху. Як тлумачыцца ў судовым вызначэньні, скарга пададзеная з парушэньнем вызначаных заканадаўствам нормаў.

Сутнасьць у тым, што з пункту гледжаньня суду «заяўленыя Кірылавым-Шмільхольдхардам патрабаваньні неканкрэтныя», з прычыны чаго ня можа быць разгледжаная і просьба заяўніка аб вызваленьні яго ад выплаты дзяржпошліны, а, «значыць, судом ня можа быць вырашанае пытаньне пра ўзбуджэнне вытворчасьці па справе».

Спадар Кірылаў-Шмільхольдхард, зьвяртаючыся ў суд, спадзяваўся, што той возьме пад увагу факт наяўнасьці ў яго справе беспрацоўнага шматлікіх мэдычных заключэньняў «урачэбна-кансультацыйных камісіяў, якія забараняюць па наяўных шматлікім мэдычных паказаньнях (хранічных захворваньнях) удзельнічаць (яму) ў грамадзкіх працах». Хоць сваімі ранейшымі дзеяньнямі ўпраўленьне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ўскосна пацьвердзіла наяўнасьць у актывіста такіх хранічных захворваньняў - за ўвесь пэрыяд яго рэгістрацыі беспрацоўным ні разу не накіравала яго для ўдзелу ў грамадзкіх працах.

Незаконныя, на яго думку, дзеяньні з боку дзяржавы, якія пазбавілі яго сацыяльных гарантыяў, Кірылаў-Шмільхольдхард лічыць перасьледам па палітычных матывах. Актывіст мяркуе, што яго ранейшая палітычная і грамадзкая дзейнасьць прывяла да прадузятага стаўленьня з боку асобных чыноўнікаў, якія маюць да яго асабістую непрыязнасьць. Так, напрыклад, 11 красавіка 2012 году ён зьвярнуўся ў гарвыканкам з заявай аб правядзеньні пікету пад лёзунгам «Жабракі, беспрацоўныя, ахвяры палітычных рэпрэсіяў - яднайцеся!». Пасьля гэтага па распараджэньні старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэту па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Аляксандра Хрыстафорава ён быў зьняты з уліку ў якасьці беспрацоўнага.



Апроч таго, як сьцьвярджае Кірылаў-Шмільхольдхард, з боку былога старшыні Віцебскага аблвыканкаму Аляксандра Косінца і вышэйзгаданага Хрыстафорава «ініцыяваўся ціск з боку псыхалягічных службаў вобласьці, якія без законных падстаў спрабавалі засадзіць (яго) ў псыхушку». Пазьбегнуць прызначанай чыноўнікамі долі ўдалося толькі «дзякуючы вялікаму рэзанансу ў сацыяльных сетках і міжнародным праваабарончым арганізацыям».

Не пакінулі, на думку актывіста, асобныя прадстаўнікі ўлады без увагі і таго факту, што ён неаднаразова заяўляў пра свой намеры ўзяць актыўны ўдзел у якасьці незалежнага назіральніка на адным з выбарчых участкаў на маючых адбыцца ў 2015 годзе выбарах прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь.

Старшыня пастаяннай камісіі ПП НС віцебскаму праваабаронцу: Парлямэнцкіх слуханьняў ня будзе

У цяперашні час зьяўляецца немэтазгодным ініцыяваньне пытаньня пра правядзеньне парлямэнцкіх слуханьняў па тэме «Вынікі правапрымяненьня Закону Рэспублікі Беларусь "Аб парадку і ўмовах накіраваньня грамадзян ў лячэбна-працоўныя прафілякторыі і ўмовах знаходжаньня ў іх"». Пра гэта паведаміў праваабаронцу Леаніду Сьвецiку старшыня пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па правах чалавека, нацыянальных стасунках і сродках масавай інфармацыі Андрэй Навумовіч.



Леанід Сьвецік, які зьвярнуўся ў Палату прадстаўнікоў з прапановай правесьці парлямэнцкія слуханьні, ставіць пад сумнеў якасьць прымусовага лекаваньня грамадзян, якія пакутуюць на алька- або нарказалежнасьць, у лячэбна-працоўных прафілякторыях (ЛПП). На ўтрыманьне, ахову і лекаваньне грамадзян у ЛПП дзяржава траціць велізарныя як матэрыяльныя, гэтак і нематэрыяльныя рэсурсы. Аднак пакуль ніхто глыбока ў ўсебакова не аналізаваў, наколькі высокая эфэктыўнасьць працы ЛПП з пункту гледжаньня эканомікі, маралі і гуманнасьці.

У сваім звароце да парлямэнтароў віцебскі праваабаронца таксама зьвярнуў увагу на тое, што кіраўнікі ўстановаў Дэпартамэнту па выкананьні пакараньняў, у непасрэдным распараджэньні якога знаходзяцца ЛПП, усяляк пазьбягаюць афішаваць, што адбываецца за калючым дротам і высокімі платамі лячэбных установаў. Таму, як сьцьвярджае Леанід Сьвецік, многімі грамадзянамі і праваабарончымі грамадзкімі арганізацыямі адмоўна ўспрымаецца тая акалічнасьць, што сыстэма ЛПП знаходзіцца ў распараджэньні МУС — дзяржаўным органе, прызначэньне якога — караць, а не лекаваць.

Апроч таго, на думку праваабаронцы, сам факт утрыманьня ў ЛПП грамадзян, якія маюць патрэбу ў лекаваньні ад алькагалізму і наркаманіі, прыніжае іх чалавечую годнасьць. Ён таксама адзначае, што грамадзкімі арганізацыямі і мэдычнымі работнікамі мэтад лекаваньня па формуле «прымусовае лекаваньне праз прымусовую працу» ўспрымаецца як парушэньне правоў чалавека, у прыватнасьці парушэньне артыкулу 8 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правох.

Зыходзячы з вышэйпададзенай аргумэнтацыі, Леанід Сьвецік прапанаваў пастаяннай камісіі ПП НС па правах чалавека, нацыянальных стасунках і сродках масавай інфармацыі выступіць ініцыятарам правядзеньня парлямэнцкіх слуханьняў па тэме «Вынікі правапрымяненьня Закону Рэспублікі Беларусь "Аб парадку і ўмовах накіраваньня грамадзян ў лячэбна-працоўныя прафілякторыі і ўмовах знаходжаньня ў іх"».

Адказ Леаніду Сьвецiку на яго прапанову прыйшоў за подпісам старшыні пастаяннай камісіі Андрэя Навумовіча. Ён паведаміў праваабаронцу, што 14 траўня 2014 году Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу быў прыняты праект Закону «Аб унясеньні зьменаў і дапаўненьняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаньнях накіраваньня грамадзян у лячэбна-працоўныя прафілякторыі і аб умовах знаходжаньня ў іх» (гэты закон набыў моц 29 чэрвеня 2014 году).

«Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў — сябры Камісіі актыўна ўдзельнічалі ў разглядзе праекту згаданага закону. Напрыклад, па маёй прапанове ў яго было ўнесенае палажэньне пра магчымасьць скарачэньня тэрміну знаходжаньня грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілякторыі. Законам таксама замацаваная норма пра спыненьне знаходжаньня ў лячэбна-працоўным прафілякторыі грамадзян, якія дасягнулі пэнсійнага ўзросту (мужчын — шасьцідзесяці гадоў, жанчын — пяцідзесяці пяці гадоў), цяжарных жанчын, інвалідаў I і II групы, грамадзян з захворваньнем, што перашкаджае іх знаходжаньню ў лячэбна-працоўным прафілякторыі, па рашэньні начальніка лячэбна-працоўнага прафілякторыя», — паведаміў Андрэй Навумовіч.

Старшыня пастаяннай камісіі ніжняй палаты беларускага парлямэнту праінфармаваў праваабаронцу таксама пра тое, што 14 траўня 2015 году ў Менскай вобласьці адбыўся сэмінар на тэму «Умовы ўтрыманьня асобаў ва ўстановах крымінальна-выканаўчай сыстэмы Рэспублікі Беларусь і парадак функцыянаваньня папраўчых установаў». Апроч дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ў сэмінары ўзялі ўдзел прадстаўнікі Адміністрацыі прэзыдэнта, Генэральнай пракуратуры, МУС, Савету Рэспублікі НС, Нацыянальнага цэнтру заканадаўства і прававых дасьледаваньняў, кіраўнікі мясцовых органаў улады. На згаданым сэмінары абмяркоўвалася і пытаньне функцыянаваньня лячэбна-працоўных прафілякторыяў.

«У сувязі з гэтым, а таксама з улікам таго, што з моманту ўступленьня ў сілу апошніх зьменаў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб парадку і ўмовах накіраваньня грамадзян у лячэбна-працоўныя прафілякторыі і ўмовах знаходжаньня ў іх" мінула менш за год, лічым ініцыяваньне пытаньня аб правядзеньне згаданых парлямэнцкіх слуханьняў ў цяперашні час немэтазгодным», — гэтак завяршыў свой адказ на прапанову праваабаронцы Леаніда Сьвецiка старшыня пастаяннай камісіі ПП НС па правах чалавека, нацыянальных стасунках і сродках масавай інфармацыі Навумовіч.

Бюлетэнь "За правы чалавека" выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.